**ПАДЗЕЯ**

# ПАЭЗІЯ НА ГАННЕНСКІМ КІРМАШЫ

**Паэтычныя сустрэчы з вядомымі паэтамі-землякамі і прадстаўнікамі Саюза пісьменнікаў Беларусі прайшлі ў рамках сёлетняга «Ганненскага кірмашу», што быў прымеркаваны да 760-гадовага юбілея Зэльвы.**

24 жніўня ў рамках праекту “Над Зэльваю кніжная радуга”, які быў прымеркаваны да юбілею пасёлка, на галоўнай сцэне свята адбылася сустрэча з вядомымі паэтамі-землякамі: Уладзімірам Мазго, Ірынай Войтка, Людмілай Воранавай-Супрун. Вядучыя вечарыны згадалі пра творчыя здабыткі Валянціна Сямянякі, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі.
Сваёй творчасцю з зэльвенцамі падзяліліся запрошаныя на свята прадстаўнікі Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў, паэты Беларусі Віктар Курловіч, Георгій Кісялёў (Ваўкавыск) і Пётр Сямінскі (Гродна).
Прысутныя свята з задавальненнем знаёміліся з дзеючай кніжнай выставай “Паэтычнае сузор’е Зэльвеншчыны”.

**ДУК "ЗЕЛЬВЕНСКАЯ РАЙОННАЯ БИБЛИОТЕКА"**

**На фота:** падчас імпрэзы.



Прысутныя свята знаёмяцца з кніжнай выставай “Паэтычнае сузор’е Зэль-
веншчыны”.




На галоўнай сцэне свята выступаюць члены СПБ, паэты Пётр Сямінскі,
Георгій Кісялёў і Віктар Курловіч.



Ураджэнец Зэльвенскага краю, паэт Уладзімір Мазго (Мінск)



Выступае член СПБ, беларуская паэтэса Ірына Войтка


Паэт, бард Людміла Воранава-Супрун